Няхай жыве ў вяках імя і справа Уладзіміра Ільіча Леніна — правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі, стваральніка і кіраўніка Камуністычнай партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы!

(З Заклікаў ЦК КПСС)

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (1217) 19 кастрычніка 1978 г. Цана 2 кап.

ПА БДУ інфармацыя

## Пічэтаўскія чытанні

**Да 100-годдзя з дня нараджэння акадэміка У. І. Пічэты, першага рэктара БДУ імя У. І. Леніна, ва універсітэце адбыліся Пічэтаўскія чытанні.**

Было прачытана больш як дзесяць цікавых і змястоўных дакладаў, у якіх раскрывалася шматбаковая навуковая і грамадска-палітычная дзейнасць вядомага вучонага.

З уступным словам на канферэнцыі выступіў намеснік дэкана гістарычнага факультэта А. Г. Кляцкоў. «У. І. Пічэта — першы рэктар Беларускага універсітэта» — так называўся даклад доктара гістарычных навук, прафесара Д. Б. Мельцара. Аб прававых праблемах феадальнай Беларусі ў працах У. І. Пічэты расказаў, прысутным кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. І. Юхо.

І. САВЕТКІНА.

## Эстафета мужнасці і братэрства

**Урачыстасці з выпадку 35-годдзя Войска Польскага, якія пачаліся ў пасёлку Леніна, прыйшлі і ў сталіцу нашай рэспублікі. У Мінск прыбыў поезд дружбы польскіх ветэранаў.**

На вакзале, які быў упрыгожан дзяржаўнымі флагамі СССР,ПНР і БССР, іх цёпла віталі прадстаўнікі грамадскасці горада-героя, воіны гарнізона.

Госці ўсклалі вянок на плошчы Перамогі да помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам, якія праявілі мужнасць і гераізм у барацьбе за вызваленне нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Польскія ветэраны ўдзельнічалі ў экскурсіі па гораду, агледзелі раёны новага жыллёвага будаўніцтва, пабылі на Кургане Славы.

Яны наведалі таксама прамысловыя прадпрыемствы, сустракаліся з воінамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, студэнтамі і выкладчыкамі БДУ імя У. І. Леніна і Беларускага політэхнічнага інстытута. У час знаходжання ў БДУ госці ўсклалі кветкі да памятнага знака выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам універсітэта, якія загінулі на франтах мінулай вайны.

Насустрач партыйнай канферэнцыі

## ІДУЦЬ СХОДЫ

На факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта ідуць партыйныя сходы. На іх камуністы ўсебакова і па-дзелавому абмяркоуваюць вынікі сваёй работы за прайшоўшы перыяд. Асноўныя пытанні — гэта задачы партыйных арганізацый у святле рашэнняў ліпеньскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС, галоуных палажэнняў і вывадау, што ўтрымліваліся ў сёлетніх прамовах Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева.

Вялікая увага надавалася пытанням далейшага якаснага паляпшэння падрыхтоўкі маладых спецыялістау з вышэйшай адукацыяй, іх маральнага і працоўнага выхавання.

На партыйных сходах факультэтаў абмяркоўваліся вынікі работы студэнтаў у СБА і ў ССГА.

Ідучы насустрач агульнауніверсітэцкай партыйнай канферэнцыі, якая адбудзецца 27 кастрычніка, кожная партыйная арганізацыя абрала на яе дэлегатаў. Імі сталі лепшыя з лепшых: актыўныя камуністы, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, выдатнікі вучобы.

Так, камуністы гістарычнага факультэта паслалі на партыйную канферэнцыю прафесароу Г. П. Давідзюка, А. С. Кляўчэню, дэкана факультэта І. В. Царук, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны І. В. Марчанку, М. К. Мазурэнку, выдатнікаў вучобы студэнтаў А. Н. Зябко, А. Д. Кішкевіча, М. В. Фурса і шмат іншых.

На механіка-матэматычным факультэце права ўдзельнічаць у рабоце універсітэцкай партканферэнцыі прадастаўлена акадэміку Ф. Д. Гахаву, прафесарам А. А. Гусаку, І. А. Прусаву, партгрупоргу С. Я. Рудакоўскай, маладому камуністу, ст. выкладчыку У. А. Габрыновічу і іншым.

Л. АНДРЭЕВА.



Пяцікурснік Ігар Мішкарудны — адзін з лепшых студэнтаў хімфака. Нягледзячы на занятасць, ён не стаіць убаку ад грамадскіх спраў факультэта. Ігар — камандзір штаба працоўных спраў і член камсамольскага бюро факультэта.

НА ЗДЫМКУ: Ігар Мішкарудны ў час практычных заняткаў.

Да ўсесаюзнага перапісу

## ЗНАЧЭННЕ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР у нашай краіне па стану на 17 студзеня 1979 года будзе праведзены чарговы перапіс насельніцтва.

Кожны перапіс насельніцтва ў Савецкім Саюзе мае вялікае палітычнае і народнагаспадарчае значэнне. Матэрыялы перапісаў неабходны для бягучага і перспектыўнага планавання народнай гаспадаркі, выкарыстоўваюцца для шматлікіх навуковых даследаванняў, маюць важнае значэнне для вывучэння гаспадарчага і культурнага жыцця краіны і змен, якія адбываюцца ў ёй у працэсе будаўніцтва камунізму.

Усесаюзны перапіс насельніцтва з'яўляецца адной з найбольш буйных і складаных статыстычных работ. Выкананне яе звязана з рашэннем многіх метадалагічных і арганізацыйных пытанняў, прыцягненнем значнай колькасці перапіснога персаналу. Паспяховае здзяйсненне ўсіх мерапрыемстваў па перапісу патрабуе актыўнага ўдзелу з боку розных устаноў, арганізацый. Заўсёды сучасна гучаць цудоўныя словы У. І. Леніна: «Справа перапісаў не ведамасная справа, а справа Рэспублікі, справа ўсіх савецкіх устаноў».

Перапісы насельніцтва праводзяцца перыядычна, як правіла, адзін раз у дзесяцігоддзе для атрымання даных аб колькасці, размешчанасці і саставе насельніцтва па ўзросце, полу, шлюбным становішчы, грамадскіх групах, нацыянальнасці і роднай мове, па ўзроўню адукацыі, занятках, аб размеркаванні яго па галінах народнай гаспадаркі і г. д. Па некаторых з названых прыкмет перапісы насельніцтва з'яўляюцца не толькі асноўнай, але і адзінай крыніцай звестак, напрыклад, аб саставе насельніцтва па нацыянальнасці і роднай мове, аб колькасці і саставе сем'яў.

Перапісы насельніцтва праводзяцца ў большасці краін свету. Але толькі ў сацыялістычных краінах матэрыялы перапісаў выкарыстоўваюцца ў інтарэсах усяго народа, для пастаяннага і няўхільнага развіцця планавай эканомікі, павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, хуткага росту дабрабыту працоўных, усяго насельніцтва.

У. І. Ленін, прыдаючы вялікае значэнне перапісам насельніцтва ў нашай краіне, пісаў, што «матэрыялы перапісаў неабходны рэспублікам з мэтай планамернай арганізацыі як вытворчасці, так і савецкіх апаратаў». Гэтыя словы актуальныя і сёння. У перыяд развітога сацыялістычнага грамадства поўныя і дакладныя звесткі аб насельніцтве з'яўляюцца важнымі зыходнымі данымі для кіравання ўсімі сферамі жыцця грамадства. Для састаўлення навукова абгрунтаваных планаў трэба мець падрабязную дэмаграфічную і сацыяльна-эканамічную характарыстыку насельніцтва. Атрымаць такую характарыстыку дазваляе дакладна падрыхтаваны перапіс, які праводзіцца па адзінай праграме, адзінай метадалогіі і адзінаму арганізацыйнаму плану.

СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

## Ад трэцяга працоўнага да трэцяга вучэбнага

На трэцім патоку другога курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ займаюцца 123 чалавекі. Амаль усе яны напярэдадні Усесаюзнага камсамольскага сходу «Запаветам Леніна верныя» сабраліся, каб падвесці вынікі трэцяга працоўнага семестра і такім чынам выявіць, з чым прыйшлі яны да Усесаюзнага сходу.

Прыблізна палова другакурснікаў правяла сваё першае студэнцкае лета ў будаўнічых атрадах, а другая — у саставе студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў працавала на ўборцы ураджаю.

Сход адкрыла сакратар камсамольскага бюро патоку Святлана Фінская. Потым аб справах студэнцкага будаўнічага атрада мехмата «Гадограф», які працаваў летам на ўборцы ураджаю ў Малдавіі, расказалі баец атрада Марына Кузняцова і камісар Ірына Сабалеўская. «Гадограф» у перакладзе з латыні значыць — «след». Добры след пакінулі будучыя матэматыкі.

Таксама ў Малдавіі працаваў і другі СБА з мехмата — «Расінка», аб якім расказала Ніна Галоўчыц, студэнтка 12-й групы. 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў — лічба атраднага асваення.

Студэнт 10-й групы Вацлаў Бядрыцкі не паехаў летам у будатрад — хацелася аддаць даніну павагі роднай школе — працаваў там летам піянерважатым. А ў верасні — сельгасработы. Вацлаў пералічвае тоны бульбы, выкапанай трыма атрадамі будучых педагогаў, расказвае аб канцэртах, вечарах адпачынку і шэфскай рабоце ў калгасах.

Адным з апошніх выступае баец камуністычнага СБА імя А. Матросава Сяргей Чыжык. Расказ яго выклікае асаблівую цікавасць. Слухаюць другакурснікі пра цяжкасці і працоўныя будні атрада, пра арганізацыю работы, распытваюць аб тым, як будзе выглядаць помнік — мемарыял Аляксандру Матросаву, пабудаваны атрадам, і па-добраму зайздросцяць. Цікавяцца: ці будуць наступным летам камуністычныя атрады?

— А што, ёсць жаданне паехаць у камуністычны? — пытаннем на пытанне адказвае Сяргей.

— Ёсць!

— Думаю, камуністычныя атрады — будучыня СБА. Да таго ж, калі працуеш не за грошы — зусім іншае пачуццё да працы ўзнікае — асаблівае, нават больш, чым высокае...

Потым другакурснікі прымаюць план работы на свой трэці вучэбны семестр. У ім — і камсамольскія сходы, і гутарка-дыспут аб будучай прафесіі настаўніка, і валейбольны турнір паміж групамі патоку, і конкурс «Ало, мы шукаем таленты!», і папулярныя на факультэце «матэматычныя баі».

Такім чынам, пасля вясёлага працоўнага лета студэнцкае жыццё ўваходзіць у будні чарговага семестра.

Т. АБРАМОВІЧ.

# Уладзімір Іванавіч Пічэта

## (Да 100-годдзя з дня нараджэння)



У кастрычніку 1978 года спаўняецца сто год з дня нараджэння аднаго з буйнейшых савецкіх гісторыкаў Уладзіміра Іванавіча Пічэты — заснавальніка гісторыка-славістычнай школы ў СССР.

Творчая спадчына Пічэты вельмі значная і шматгранная. Вучоны шырокага дыяпазону, ён апублікаваў больш як 500 прац па гісторыі Расіі, Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі, Югаславіі, міжславянскіх сувязях. Пічэта ўнёс важкі ўклад у станаўленне і развіццё беларускай савецкай гістарычнай навукі. Шматлікія, шырока вядомыя яго даследаванні не згубілі сваёй каштоўнасці да нашага часу. Плённая дзейнасць выдатнага вучонага атрымала шырокае прызнанне навуковай грамадскасці Савецкага Саюза і за мяжой.

У. І. Пічэта нарадзіўся ў 1878 годзе 9 (21) кастрычніка ў Палтаве. Яго бацька, Іван Хрыстафоравіч, родам з Герцагавіны, на працягу 35 год быў выкладчыкам, а затым рэктарам Палтаўскай і Віцебскай духоўных семінарый.

Пасля заканчэння класічнай гімназіі, у 1897 годзе Пічэта паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, які скончыў у 1901 годзе з дыпломам першай ступені.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя застала Уладзіміра Іванавіча выкладчыкам Вышэйшых жаночых курсаў і Практычнай акадэміі камерцыйных навук. Ён адразу ж стаў на бок Савецкай улады.

У. І. Пічэта вярнуўся ў Маскоўскі універсітэт. Адначасова выкладаў у Ваенна-педагагічным інстытуце, у вышэйшай школе каманднага саставу. У 1918 годзе ён зацвярджаецца галоўным інспектарам Цэнтральнага архітэктурнага ўпраўлення.

Адным з самых важных этапаў у жыцці У. І. Пічэты з'явілася яго работа па арганізацыі Беларускага універсітэта і станаўленню беларускай гістарычнай навукі.

10 ліпеня 1921 года Народны камісарыят адукацыі БССР назначыў прафесара У. І. Пічэту рэктарам Беларускага універсітэта. У цяжкія гады разрухі пасля грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі ён з невычэрпнай энергіяй і засяроджанасцю ўзяўся за стварэнне першага ў Беларусі цэнтра па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі і навуковых устаноў рэспублікі. За кароткі тэрмін была праведзена вялізная арганізацыйная работа па падбору прафесарска-выкладчыцкага саставу, распрацоўцы планаў, падрыхтоўцы матэрыяльнай базы, памяшканняў для заняткаў, камплектаванню фундаментальнай бібліятэкі. Каб адкрыць шлях да вышэйшай адукацыі дзецям працоўных, быў створаны рабочы факультэт. На першы курс было залічана 1 399 студэнтаў.

30 кастрычніка 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё універсітэта. З гэтага часу разам з напружанай арганізатарскай дзейнасцю У. І. Пічэта вядзе вялікую выкладчыцкую работу. Ён чытае лекцыі па гісторыі Беларусі, гісторыі народнай гаспадаркі Расіі, гісторыі беларускага права, гісторыі славян.

У кастрычніку 1926 года ў сувязі з 25-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці ўрад прысвоіў У. І. Пічэце званне заслужанага прафесара БССР.

Гады знаходжання ў Мінску сталі адным з найбольш плённых перыядаў навуковай творчасці вучонага. На працягу 1921—1929 гадоў Пічэтай было апублікавана 150 манаграфій, артыкулаў і рэцэнзій па гісторыі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўству, гісторыі права, археалогіі, архівазнаўству, краязнаўству Беларусі.

Цэнтральнае месца ў даследаваннях У. І. Пічэты займалі праблемы сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі XV — пачатку XVII ст.

Дзякуючы арганізатарскаму таленту У. І. Пічэты, Беларускі універсітэт ператварыўся ў буйны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў. К 1930 году ён выпусціў больш за тры тысячы чалавек, у тым ліку 665 юрыстаў і эканамістаў, 476 выкладчыкаў грамадскіх навук, 316 фізікаў і матэматыкаў, 336 лінгвістаў, 528 біёлагаў і 695 урачоў.

Калі універсітэт пачаў сваю работу, прафесарска-выкладчыцкі састаў налічваў 14 прафесароў, 49 выкладчыкаў, 10 асістэнтаў, 8 лабарантаў. У 1927-28 навучальным годзе ў ім ужо працавала 49 прафесароў, 51 дацэнт, 118 выкладчыкаў і асістэнтаў, 39 ардынатараў. У 1929 годзе ва універсітэце было ўжо больш як 300 навукова-супрацоўнікаў.

На працягу ўсіх год «мінскага перыяду» жыцця Пічэта вядзе нястомную дзяржаўную і грамадскую дзейнасць. Ён унёс значны ўклад у стварэнне Інстытута беларускай культуры (студзень 1922 г.), які стаў вядучай навукова-даследчай установай рэспублікі.

Уладзімір Іванавіч быў выбран членам Інбелкульта, з'яўляўся старшынёй гісторыка-архіўнай секцыі. Яму належала ініцыятыва пераўтварэння Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук БССР. У снежні 1928 года Пічэта ў ліку першых быў абраны яе сапраўдным членам. З яго імем звязана арганізацыя архіўнай справы ў Беларусі, стварэнне адзінага дзяржаўнага архіўнага фонду, Цэнтральнага архіва БССР.

У. І. Пічэта з'яўляўся членам ЦВК БССР 3—9-га скліканняў, неадназова выбіраўся дэлегатам з'ездаў Саветаў, членам Мінскага гарсавета. Ён прыняў актыўны ўдзел у стварэнні Беларускага аддзялення Усесаюзнага таварыства культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Таварыства бязбожнікаў БССР, прэзідэнтам якога ён з'явіўся.

Васьмігадовае знаходжанне У. І. Пічэты ў Мінску (да 1929 года ў якасці рэктара, да 1930 — прафесара БДУ), яго навуковая і педагагічная работа, актыўная грамадская дзейнасць пакінулі глыбокі след у развіцці беларускай сацыялістычнай культуры, беларускай савецкай гістарычнай школы, вышэйшай адукацыі і асветы рэспублікі.

**Д. МЕЛЬЦАР,**
**доктар гістарычных навук, прафесар.**

# Шэфству — новыя формы і метады

Ужо шмат гадоў пры камітэце камсамола філалагічнага факультэта існуе педагагічны клуб «Сэрца аддаю дзецям», які вядзе ўсю шэфскую работу. Клуб мае свой савет, яго ўзначальвае прэзідэнт. Цяпер ужо стала відавочна, што стварэнне педагагічнага клуба замест існаваўшай раней звычайнай формы работы шэфскага сектара мае сваю перавагу. І тлумачыцца гэта тым, што мы атрымалі магчымасць звязаць усю работу на розных напрамках у адно цэлае, а гэта дазволіла нам глыбей выкарыстоўваць нашы магчымасці, зрабіць нашу шэфскую дапамогу школьнікам больш дзейснай і эфектыўнай.

Напрыклад, раней мы мелі ў кожнай падшэфнай арганізацыі асобныя агітбрыгады, гурткі, секцыі, якія працавалі непасрэдна толькі ў сваёй школе, домакіраўніцтве. Цяпер мы маем магчымасць наладзіць цесныя сувязі не толькі з падшэфнай арганізацыяй, але і дапамагчы школьнікам сябраваць паміж сабой. Так, рабяты аднаго з домакіраўніцтваў г. Мінска з задавальненнем прымалі ў сябе агітбрыгаду Вязынскай школы Маладзечанскага раёна. А вучні 41-й школы з цікавасцю і задавальненнем рыхтавалі метадычныя дапаможнікі для піянераў Хатлянскай школы. А з якім агеньчыкам рыхтаваліся рабяты ўсіх падшэфных школ і домакіраўніцтваў да агульнауніверсітэцкага агляду мастацкай самадзейнасці школьнікаў! Як яны імкнуліся дапамагчы ў падрыхтоўцы сваім сябрам з сельскіх школ! А пасля агляду ўсе разам яны знаёміліся з Мінскам.

Яшчэ большыя магчымасці з'явіліся ў нас, калі мы пачалі выкарыстоўваць новыя формы арганізацыі шэфскай работы. Так, раней наша дапамога школьнікам з аддаленых ад Мінска раёнаў зводзілася толькі да аднаго-двух выездаў у год факультэцкай агітбрыгады. І гэта было зразумела: не заўсёды мы маглі атрымаць транспарт, а дабірацца маршрутнымі аўтобусамі вельмі цяжка. Тады на савеце клуба было вырашана: трэба выкарыстоўваць завочныя формы работы. І вось у Хатлянскую школу адпраўлены пісьмы, бандэролі, пасылкі. Шэфы высылалі сваім піянерам кантрольныя заданні для алімпіяды, кнігі, матэрыялы для стэндаў і альбомаў. І сельскія школьнікі былі шчыра ўдзячны сваім сябрам за дапамогу.

Такім чынам, сама сабой напрошваецца думка аб тым, што пры ўсіх тых цяжкасцях, якія стаяць перад намі ў арганізацыі шэфскай работы, мы маем шырокія магчымасці ў выкарыстанні новых форм і метадаў шэфства.

**І. ФЁДАРАВА,**
**студэнтка філфака, прэзідэнт клуба «Сэрца аддаю дзецям».**



**Дацэнт кафедры арганічнай хіміі Павел Мітрафанавіч Малашка кансультуе аспіранта кафедры Алега Грынкевіча.**

# ВНУ — прадпрыемства агульны

Кафедра фізікі паўправаднікоў мае дзве вучэбна-вытворчыя базы: на ВА «Інтэграл» і ў НДІ ПФП пры БДУ. Будучыя вучоныя, інжынеры, тэхнолагі маюць магчымасць ужо ў студэнцкія гады азнаёміцца з вытворчасцю, адчуць яе рэальныя патрэбы. Тэмы дыпломных работ, якія выконваюць студэнты кафедры на ВА «Інтэграл» і ў НДІ ПФП, непасрэдна звязаны з навейшымі распрацоўкамі і даследаваннямі, што праводзяцца ў гэтых арганізацыях. Толькі ў 1977 годзе па кафедры былі рэкамендаваны да ўкаранення 15 студэнцкіх навуковых работ. Акрамя таго, калектыў

Выпускнік кафедры В. Гусакоў ужо ў першы год работы ў НДІ ПФП падаў заяўку на вынаходства. У першы год работы на ВА «Інтэграл» выпускнікі кафедры У. Шматкоў, В. Тулузкоў апублікавалі па аднаму артыкулу, А. Амелін атрымаў аўтарскае пасведчанне.

Развіццю студэнцкай навуковай творчасці садзейнічаюць шырокае абмеркаванне вынікаў даследаванняў на семінарах, канферэнцыях, удзелы ў конкурсах. Штогод каля 30 працэнтаў студэнтаў кафедры выступаюць з дакладамі на універсітэцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі. Звычайна даклады студэнтаў кафедры вылучаю-

кафедры выконвае для ВА «Інтэграл» шэраг дагаворных тэм, у распрацоўку якіх пэўны ўклад уносяць і студэнты. Такім чынам студэнты яшчэ ў працэсе навучання ў ВНУ прымаюць семы непасрэдны ўдзел у рашэнні навуковых і вытворчых задач.

Вучэбна - навукова - вытворчыя аб'яднанні дазваляюць кафедры прыцягнуць да самастойнай навуковай работы абсалютную большасць студэнтаў. У 1977 годзе ў выкананні толькі гасдагаворных тэматыкі на кафедры і ў НДІ ўдзельнічала 60 студэнтаў. Вынікам гэтай работы з'яўляюцца сумесныя публікацыі студэнтаў і супрацоўнікаў, аўтарскія заяўкі. Па матэрыялах дыпломнай работы студэнта В. Суслава, выкананай у гэтым годзе ў рамках гасдагаворнай НДР з ВА «Інтэграл», Дзяржкамітэтам па справах вынаходстваў прынята заяўка на вынаходства.

Праходжанне практыкі на вучэбна-вытворчых базах пад кіраўніцтвам высокакваліфікаваных спецыялістаў дае магчымасць студэнту паглыбіць свае тэарэтычныя веды, азнаёміцца з навейшымі дасягненнямі галіны, з перадавымі метадамі і прыёмамі працы, набыць практычныя навыкі работы па спецыяльнасці. Усё гэта скарачае тэрміны адаптацыі маладога спецыяліста, дапамагае яму ў выбары будучай работы, у ацэнцы сваёй прафесіянальнай прыгоднасці.

ца ў спецыяльную секцыю, на пасяджэннях якой прысутнічаюць выкладчыкі, супрацоўнікі НДІ ПФП. У гэтым годзе арганізавана секцыя мікраэлектронікі на ВА «Інтэграл», што дало магчымасць абмеркаваць вынікі работы з удзелам вядучых спецыялістаў вытворчасці.

Аб высокім навуковым і тэхнічным узроўні студэнцкіх навуковых работ сведчыць і шырокі ўдзел студэнтаў кафедры ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях і аглядах. Ужо ў 1978 годзе студэнтамі кафедры зроблена 9 дакладаў на канферэнцыях. З 23 работ, прадстаўленых кафедрай у 1978 навучальным годзе на Рэспубліканскі агляд-конкурс, сем работ было выканана ў НДІ ПФП.

Пашырэнню навуковага кругагляду студэнтаў, фарміраванню ў іх навуковага светапогляду садзейнічае і ўдзел студэнтаў у рабоце навуковага семінара кафедры, які праводзіцца пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН БССР, прафесара В. Д. Ткачова. На семінары абмяркоўваюцца найбольш актуальныя праблемы фізікі і тэхнікі паўправаднікоў, апошнія дасягненні калектыву кафедры і аддзела фізікі паўправаднікоў НДІ ПФП. Тут як бы сустракаецца мяжа паміж выкладчыкамі і студэнтамі: кожны, хто прысутнічае на семінары, можа выказаць свой пункт гледжання, прыняць удзел у дыскусіі.

# НАШ ПРАЦОЎНЫ ПАДАРУНАК

Набліжаецца слаўная дата савецкай камсамоліі — яе шасцідзесяцігадовы юбілей. Шматтысячная армія маладых поўна рашучасці дастойна сустрэць гэтую гістарычную падзею.

Першакурснікі факультэта журналістыкі, якія працавалі ў саўгасе «Высакоўскі», на камсамольскім сходзе вырашылі арганізаваць нядзельнік, прысвечаны юбілею ВЛКСМ, а сродкі, зарobленыя ў гэты дзень, перадаць у фонд ЦК ЛКСМ Беларусі.

На нядзельнік выйшлі ўсе. Найлепшых вынікаў дасягнулі студэнты, што падбіралі клубні пасля бульбакапалкі. Выдатна працавалі Іна Міхайлоўская, Алена Ціхановіч, Валерый Мароз. Зладжана, рытмічна спраўлялася з даручанай справай брыгада Любові Цуканавай, вельмі стараліся Павел Цунік, Ала Рыжкевіч, Людміла Турбал, Віктар Сабалеўскі, Наталля Шчалканогава.

За пяць гадзін атрад з чатырнаццаці першакурснікаў сабраў больш як 16 тон клубняў, выкана[illegible]цы, такім чынам, дзённае заданне на 123,4 працэнта. Міхайлоўская, Цуканава і Цунік прызнаны пераможцамі дня ў сацспаборніцтве.

**Б. ЯЎСЕЙЧЫК.**

Работа студэнтаў на вучэбна-вытворчых базах знаходзіцца ў цэнтры ўвагі кафедры. Пытанні, якія звязаны з той ці іншай формай дзейнасці, вырашэннем розных навуковых задач, абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедры, на навуковых і метадычных семінарах. Хутка прагрэсіруючая і змяняючая свае формы паўправадніковая мікраэлектроніка прымушае штогод перапрацоўваць праграмы спецкурсаў і спецпрактыкумаў. Так, на IV і V курсах чытаецца тэхналогія вытворчасці інтэгральных схем і схематэхніка, прычым, змест спецкурса абапіраецца на сучасны ўзровень развіцця паў-

## КЛОПАТ

праваднiковай электронікі. Да чытання спецкурсаў прыцягваюцца вядучыя спецыялісты ВА «Інтэграл» (Ю. І. Савоцін, А. І. Сухапараў). Студэнты выконваюць лабараторныя работы на абсталяванні ВА «Інтэграл», рыхтуецца да пастаноўкі новы лабараторны практыкум па тэхналогіі паўправадніковых прылад на кафедры.

Вялікае значэнне маюць вучэбна-вытворчыя базы для правядзення грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Чытанне лекцый для работнікаў аб'яднання, выпуск насценгазет, удзел у рабоце камсамольскай арганізацыі прадпрыемства з'яўляюцца добрай школай для ідэйна-палітычнага выхавання. Набыты вопыт дапамагае студэнтам кафедры весці актыўную грамадскую дзейнасць як у сценах універсітэта, так і пасля заканчэння яго. Так, выпускнікі кафедры У. Шматкоў, Г. Барысава з'яўляюцца зараз намеснікамі сакратара камітэта камсамола ВА «Інтэграл».

Такім чынам, супрацоўніцтва кафедры з ВА «Інтэграл» і НДІ ПФП уносіць значны ўклад у вучэбны працэс, у навуковую і грамадскую дзейнасць студэнтаў. Развіццё форм і метадаў такога супрацоўніцтва, прапаганда перадавога вопыту будуць садзейнічаць падрыхтоўцы ўсебакова развітых спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**Т. КОЛЬЧАНКА, Т. ПРАЦЬКО.**



Да 60-годдзя Ленінскага камсамола

# Маршруты выхаднога дня

На перакрыжаванні трох дарог паказальнікі сведчаць: да Масквы — 730 км, да Вільнюса — 160, да Мінска—41. Іменна тут, недалёка ад гарадскога пасёлка Радашковічы, на чацвёрты дзень вайны здзейсніў свой бессмяротны подзвіг экіпаж самалёта, якім кіраваў малады камуніст Герой Савецкага Саюза Мікалай Гастэла. Імёны і прозвішчы герояў напісаны на сімвалічных бетонных крылах, над якімі ўзнёсся ў неба сам помнік.

На ўрачыстую лінейку ля помніка выстраіліся студэнты - першакурснікі пяці факультэтаў нашага універсітэта — удзельнікі масавага паходу выхаднога дня, які арганізавалі клуб турыстаў і кафедра фізічнага выхавання сумесна з камітэтам камсамола БДУ. Паход гэты стаў адным са звенняў Усесаюзнай турысцкай экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР» і праводзіўся з мэтай здачы норм ГПА па турызму студэнтамі першых курсаў, а таксама з мэтай прапаганды развіцця турызму ў нашым універсітэце.

Сабраўшыся раніцай у нядзелю ва універсітэцкім двары, першакурснікі раздзяліліся на невялікія турысцкія групы па 15—20 чалавек, кожную з якіх вёў вопытны інструктар — член клуба турыстаў і альпіністаў БДУ ці выпускнік універсітэцкай школы турысцкіх арганізатараў. У кожнай групы быў свой уласны маршрут, распрацаваны спецыяльнай пешаходнай камісіяй.

Да месца старту паходу ўдзельнікі дабіраліся па чыгунцы. Цікава было прайсці па вагонах ранішняй электрычкі, што ішла ў бок Маладзечна. У адным вагоне — спяваюць, у другім не змаўкае смех — нешта цікавае расказвае сваёй групе інструктар, а вось, стоячы ў праходзе, дзяўчаты разбіраюць нешта ў канспекце і спрачаюцца. Зразумела — матэматыкі. Але рашаць задачы нават у паходзе, безумоўна, здольны толькі першакурснікі.





Першыя групы пакідаюць электрычку ў Вязынцы, астатнія выходзяць у Дубравах і Баярах.

Вязынка — месца асабліва цікавае для філолагаў. Яны паспяваюць хуценька агледзець музей і запаведнік. А потым цудоўнымі купалаўскімі мясцінамі, апранутымі ў чырвань і золата восені, — да месца сустрэчы ўсіх атрадаў — да помніка.

У кожнай групе свае прыгоды на маршруце, свае цяжкасці. Але разам з сябрамі крочыць і цікава і весела. Дзе ж яшчэ так раскрываецца чалавек, як не ў дарозе? А гэта яшчэ адна магчымасць пасля сумеснай работы на ўборцы бліжэй пазнаёміцца з аднакурснікамі.



Вось крочаць з песняй дзяўчаты з ФПМ, «філалагіні» цеснай групкай абступілі свайго інструктара, які расказвае па дарозе аб клубе універсітэцкіх турыстаў, аб апошніх паходах. Абедзве групы будучых журналістаў ідуць амаль разам, дапамагаючы сябрам пераадольваць даволі крутыя ўзгоркі і мокрыя нізінкі. Усё было як у сапраўдным паходзе — і чай з пахам дыму на прывале, і турысцкія песні ля кастра.

А потым урачыстая лінейка ля помніка. Кіраўнік клуба турыстаў БДУ, супрацоўнік ФПМ А. І. Новікаў рапартуе аб гатоўнасці груп да правядзення мітынгу, які адкрывае намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта Мікалай Прыгодзіч.

Перад першакурснікамі выступілі дэлегат XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, студэнтка V курса юрыдычнага факультэта Тамара Аўдацейка і дэлегат XVIII з'езда ВЛКСМ, пяцікурсніца геафака Таццяна Свіціна.

Пасля мітынгу групы зноў разыходзяцца па сваіх маршрутах. Незвычайны выхадны дзень працягваецца.

**Т. САХАШЧЫК.**

**НА ЗДЫМКАХ: выступае дэлегат XVIII з'езда ВЛКСМ пяцікурсніца геафака Таццяна Свіціна; студэнтка V курса юрыдычнага факультэта Тамара Аўдацейка, якая ўваходзіла ў склад савецкай дэлегацыі на XI Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Гаване, расказала аб ім першакурснікам; да удзельнікаў турысцкага злёту звяртаецца намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ М. Прыгодзіч.** **Фота аўтара.**





# Нічога не здарылася...

— Ігар, праспявай, калі ласка, што-небудзь «дэсантнае».

— Што спець? Вы ж усё ўжо чулі.

— Праспявай сваю любімую — «Синеву».

Ігар Мартынаў, не спяшаючыся, паправіў на плячы рэмень гітары, узяў некалькі нескладаных акордаў і ціха запеў:

**Расплескалась синева,**
**расплескалась,**
**По тельняшкам разлилась,**
**по беретам,**
**Даже в сердце синева**
**завязалась,**
**Зацвела своим**
**заманчивым цветом.**

Простыя словы, няхітры матыў. Звычайная салдацкая песня. У кожным палку, у кожнай роце ёсць свая песня. У дэсантным падраздзяленні, дзе служыў Ігар Мартынаў, такой песняй была «Синева». У час кароткіх салдацкіх перакураў, на вучэннях, у мінуты чакання самалётаў на аэрадроме гвардыі яфрэйтар Мартынаў ціхенька напяваў:

**Помню в детстве на**
**коврах-самолётах**
**Открывали мы земные**
**маршруты,**
**А теперь нашлась нам**
**в небе работа:**
**Наполняем синевой**
**парашюты.**

Больш за 120 парашутных скачкоў, сотні кіламетраў маршаў і кросаў, удзел у парадах, заняткі самба і стральбой — усё гэта зведаў Ігар за два нялёгкія армейскія гады. А яшчэ яму неаднойчы прыходзілася выязджаць на размініраванне.

...У той дзень над Дубровіцай было чыстае сіняе неба. Бульбаўборачны камбайн, на якім працавалі студэнты факультэта журналістыкі, павольна рухаўся па полі. Раптам пачуўся стук у барабане камбайна — і на транспарцёр выпаўзла заржавелая металічная балванка. Усе на некалькі імгненняў замерлі.

— Стой! — закрычалі трактарысту ў адзін голас Жора Журко і Славік Бяляеў.

— Рабяты, што гэта? — спытаў Слава.

— Дык гэта ж снарад. Сорак пяты калібр, — беспамылкова ўстанавіў Журко.

— Яго трэба адцягнуць убок, — прапанаваў Бяляеў.

— Не спяшайся, Славік, — папярэдзіў Мартынаў. — Бачыце, снарад з узрывацелем. Хоць бы бяды не здарылася. Трэба паведаміць у праўленне калгаса, а я пакуль аднясу снарад падалей.

Ігар асцярожна, нават неяк беражліва ўзяў у рукі снарад і паклаў яго ў густую траву ля краю поля.

Праз паўгадзіны аб здарэнні на полі даведаўся парторг калгаса «Герой працы» Васіль Іванавіч Сяднёў. Ён паведаміў аб небяспечнай знаходцы ў раённы цэнтр, і прыбыўшыя з Клімавіч сапёры хутка абясшкодзілі снарад.

Пасля работы Ігар Мартынаў быў такім жа, як і заўсёды. Ён шмат жартаваў, смяяўся, спяваў.

Вось толькі курыў у гэты вечар больш звычайнага.

**В. МАСКАЛЁЎ.**


**АБ'ЯВА**

У паліклініцы БДУ 23—24 кастрычніка з 10 да 15 гадзін праводзіцца Дзень донара.

Чакаем вас на донарскім пункце.

Студэнты, якія здадуць кроў, вызваляюцца ад заняткаў на 5 дзён.

**Камітэт камсамола, прафком, камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа.**




**Падвядзеннем вынікаў працоўнага семестра пачала новы навучальны год кафедра агульнага смехаробства. СБА кафедры рапартавалі аб выкананні планаў як мага больш дзейснага данясення жартаў, гумару і сатыры да насельніцтва ў месцах дыслакацыі. Сельгасатрады ў сваю чаргу падзяліліся выдатным ураджаем народнага гумару, які яны сабралі за час восеньскіх сельгасработ.**

**Лабарант Пісулькін на першым пасяджэнні абвясціў навіны кафедры: дацэнт Незалікін мінулым летам надрукаваў сваю новую навуковую працу аб карысным уплыве гумару на рост паспяховасці студэнтаў, выкладчык Меркавальнікаў адпусціў вусы і бараду, а Шура Шпора, які прыйшоў на кафедру ў 1976 годзе, паспяхова апынуўся ўжо на трэцім курсе.**

# Ахейцы і траянцы

Ахейцы нападаюць. Траянцы іх адбіваюць. Ахейцы так — траянцы гэтак. Увогуле, прыгожая Алена стала прычынай масавых пабоішчаў. Ну дык добра, хітрамудры Адысей прыдумаў траянскага каня і адправіў ахейцаў на нарыхтоўкі лесаматэрыялу. Усё б добра, ды злапаў іх ляснік і канфіскаваў тапары. Гэтак? І ахейцы канфіскавалі лесніка.

Адысей учыніў яму допыт:

— Якія ёсць коні ў Трэі?

— Жывыя.

— А другія?

— З мармуру.

— А яшчэ?

— Высечаныя з граніту, адлітыя з бронзы, выразаныя з бука.

— А з маладога дуба ёсць?

— Не, такіх няма.

Тады ахейцы насеклі дубовых ствалоў, зрабілі з іх каня, прыцягнулі ў свой лагер, схавалі каню ў бруха воінаў, селі на караблі і адплылі ў адкрытае мора. Траянцы без бою захапілі іх пусты лагер — і проста да каня.

— Арыгінальна! — сказаў Парыс. — Бачыў я статуі з мармуру, граніту, бронзы, бука, а вось з маладога дуба не даводзілася.

— Арыгінальна — згадзіліся іншыя траянцы. — Па форме, кампазіцыі і стылю — банальна, але вось тое, што матэрыял — малады дуб, арыгінальна. Наватарства!

— Наватарства! — пацвердзіў Парыс і загадаў даставіць каня ў крэпасць.

Увечары схаваныя ахейцы вылезлі з бруха каня, закалолі вартавых і адкрылі вароты крэпасці.

Вось чаму з тае пары і па сённяшні дзень глядзяць на ўсякае наватарства як на траянскага каня.

Веліка НАНЕЎ.

Пераклаў з балгарскай на рускую мову Г. Антонаў.

Пераклаў з рускай на беларускую мову выкладчык кафедры агульнага смехаробства Канспектаў.

# Размеркаванне

**Студэнт.** Падрываеце свой прэстыж дэкана, аўтарытэт ВНУ! Вы аб гэтым падумалі?

**Дэкан.** Аб чым, аб чым гэта?

**Студэнт.** Каго вы пасылаеце ў сяло? Каго вы пасылаеце сеяць «разумнае, добрае, вечнае»? Пятрэнка! Якія ён веды перадасць дзецям?

**Дэкан.** О-о! Нарэшце да вас пачынае даходзіць.

**Студэнт.** Да мяне дайшло! А вось дойдзе да інстытута, калі мяне спытаюць калегі, у каго я вучыўся! Я праўду скажу! У прафесара Заічэнкі, у вельмі паважанага дэкана... Што яны падумаюць?

**Дэкан.** Ну і што ж яны падумаюць?

**Студэнт.** Ай-яй-яй, падумаюць яны... што ж гэта там за Заічэнка такі, што за пяць год нічому не змог навучыць...

**Дэкан.** Прабачце.

**Студэнт.** Не трэба, Пётр Пятровіч, прасіць прабачэння. Прыедзе камісія з РАНА... Абагульніць. Напішуць на імя рэктара: каго вы там рыхтуеце? Уяўляеце, якая слава пойдзе пра наш інстытут?

**Дэкан.** Але ж...

**Студэнт.** Будуць абмяркоўваць вас на вучоным савеце. Я ўжо бачу, як хістаецца пад вамі дэканскае крэсла для чаго прымалі, для чаго трымалі і дзяржаўныя сродкі трацілі... і як вы клапоціцеся аб кантынгенце. І дзе ваша ўменне працаваць індывідуальна з кожным студэнтам... і...

**Дэкан.** Што ж цяпер рабіць?

**Студэнт.** Іванова пасылайце ў сяло. У яго — веды. Яму ёсць што перадаць дзецям, і калегам не сорамна сказаць, у каго ён вучыўся. Пра інстытут пойдзе слава...

**Дэкан.** Правільна! Іванова — у сяло. Але-е... Як жа з вамі?

**Студэнт.** Адзін шлях — у аспірантуру!

**Дэкан.** Што-о-о? Я з вамі і так пяць год мучыўся!

**Студэнт.** Памучаецеся яшчэ крыху. І час у мяне будзе чаму-небудзь навучыцца. Можа, і дысертацыю выпакутуем!

**Дэкан.** Удваіх?

**Студэнт.** Не выпускаць жа мяне без навуковай работы. Пацікавяцца, хто быў кіраўніком. Абагульняць. Зробяць вывад аб падрыхтоўцы навуковых кадраў у інстытуце...

**Дэкан.** (хапаецца за сэрца).

**Студэнт.** Не хвалюйцеся, Пётр Пятровіч. Беражыце здароўе. Нам яшчэ працаваць і працаваць з вамі!

**Студэнт.** Значыць, у сяло?

**Дэкан.** У сяло, Пятрэнка, у сяло.

**Студэнт.** А Іванова пакідаеце ў аспірантуры?

**Дэкан.** Пакідаю, Пятрэнка, пакідаю.

**Студэнт.** І гэта справядліва?

**Дэкан.** Справядліва. У Іванова — веды, а ў вас? На шпаргалках пяць гадоў выязджалі. Папрацуеце настаўнікам.

**Студэнт.** Не думаеце вы аб будучым пакаленні, Пётр Пятровіч... Дзеці вам гэтага не даруюць.

**Дэкан.** Што, што яшчэ?

**Студэнт.** ... скае крэсла...

**Дэкан.** Вы перабольшваеце!

**Студэнт.** Аб гэтым вы скажаце ў Міністэрстве! Пашкадуеце яшчэ, што паслалі Пятрэнку ў сяло, але будзе позна.

**Дэкан.** Ну-ну, ну-ну. Прабачце, таварыш Пятрэнка, а ці не змаглі б вы... не гаварыць калегам, у каго вы вучыліся?

**Студэнт.** Чаму ж я павінен чырванець за вас, Пётр Пятровіч?

**Дэкан.** Эх, чаму ж я вас не выключыў яшчэ на другім курсе?

**Студэнт.** Якраз аб гэтым у вас і спытаюцца:

А. ЖЫТНІК.

Рэпліка

# Чаму адна з трох?

«Міграцыя — вялікае перасяленне народаў унутры краіны ці за яе межы» — так трактуе тлумачальны слоўнік. У нашым жа з вамі універсітэцкім жыцці міграцыя — вялікае перасяленне студэнцтва з аўдыторыі ў другую аўдыторыю ці, нават, у другі корпус за час кароценькага 10-мінутнага перапынку. Вам не даводзілася на перапынку паміж «парамі» ўвайсці ці выйсці з галоўнага корпуса з боку універсітэцкага двара? Ага, па вачах бачу, — даводзілася! Вы гублялі гузікі і канспекты, штурмуючы гэтыя злашчасныя дзверы. Хвалі тых, хто імкнецца ўвайсці ці выйсці, кідалі вас ад сяброў на выкладчыкаў і наадварот, з вас збівалі ў натоўпе і акуляры, і капелюшы, і вы ўсё роўна абавязкова спазняліся на лекцыю. Калі натоўп схлыне — зірніце, калі ласка, на прыступку каля трох дзвярэй, што вядуць з універсітэцкага двара ў галоўны корпус. Каля сярэдняй з іх — глыбокая калдобіна — вынік рэгулярных студэнцкіх міграцый, — а абедзве крайнія — як новенькія.

Відавочна, што камендант галоўнага корпуса ніколі не імкнецца ўвайсці ці выйсці ў гэтыя дзверы ў час перапынку. А калі б паспрабаваў, то, можа, і пашкадаваў бы шчарбатую прыступку, ды й адчыніў бы замест адной усе тры дзверы.

Трэцякурснік Ш. ШПОРА.

# Вясёлы алоўак



Малюнкі Ю. НОВІКАВА і А. ДАНЕКІНА.

# 714400 шчаслівых выйгрышаў

Дзяржаўная 3-працэнтная ўнутраная пазыка выпуску 1966 года карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва.

З месяца ў месяц расце колькасць асоб, якія купілі аблігацыі гэтай пазыкі, і павялічваецца сума аблігацый, набытых насельніцтвам.

Зазначаная пазыка выпушчана тэрмінам на 20 год з 1 ліпеня 1966 года па 1 ліпеня 1986 года, аблігацыі гэтай пазыкі выпушчаны асобнымі пазыкамі разрадамі па 100 млн. рублёў. Кожны разрад складаецца са 100 тысяч серый, якім прысвоены нумары ад 100 001 да 200 000, у кожнай серыі ёсць аблігацыі ад нумара 01 па нумар 50. На адзін разрад пазыкі разыгрываецца: 2 выйгрышы па 5 000 руб., 5— па 2 500, 20—1000, 109— па 500, 750 — па 100 і 8 514 — 40 рублёў, а ўсяго 9 400 выйгрышаў на суму 512 600 рублёў.

Зараз у абарачэнні знаходзіцца 76 разрадаў, у якіх будзе разыграна 714 400 выйгрышаў на суму 38 954 560 рублёў.

Аблігацыі пазыкі выпушчаны вартасцю ў 20 і 10 рублёў. Іх прадаюць і купляюць усе ашчадныя касы. Продаж аблігацый адбываецца па цэнах, вызначаных Міністэрствам фінансаў СССР, а купля — па намінальнай вартасці. Трэба адзначыць, што аблігацыі выгадней купляць адразу ж пасля адбыўшагася тыражу выйгрышаў, бо на працягу 15 дзён пасля кожнага тыражу курсавая вартасць іх самая нізкая — 20 руб. 10 кап., наступныя 15 дзён перад тыражом — 20 руб. 50 кап.

Дзесяцірублёвыя аблігацыі з адзначаных перыядаў прадаюцца ў палову цаны, устаноўленай для аблігацый дваццацірублёвай вартасці.

Даход па пазыцы выплачваецца ў выглядзе выйгрышаў з разліку, як паказвае яго назва, тры працэнты гадавых. Выйгрышы на аблігацыі вартасцю 20 рублёў вызначаны (уключаючы намінальную вартасць) у памеры 5 000, 2 500, 1 000, 500, 100 і 40 рублёў. Па дзесяцірублёвых аблігацыях выйгрышы выплачваюцца ў палавінным размеры.

Аб выгадзе захавання грашовых зберажэнняў у аблігацыях Дзяржаўнай 3-працэнтнай унутранай выйгрышнай пазыкі сцвярджаюць такія даныя: толькі за 1977 год жыхарам горада Мінска выплачана выйгрышаў па гэтай пазыцы больш як 960 тыс. руб.

Па пазыцы штогод праводзіцца восем тыражоў праз кожныя паўтара месяца, а за дваццацігадовы перыяд адбудзецца 160 тыражоў выйгрышаў. На працягу тэрміну дзеяння пазыкі выйграюць 30 працэнтаў аблігацый. Астатнія 70 працэнтаў аблігацый пасля заканчэння тэрміну выкупляюцца па намінальнай вартасці.

Верагоднасць выйгрышу па аблігацыях пазыкі павялічваецца з кожным новым тыражом, паколькі колькасць выйгрышаў, якія разыгрываюцца ў тыражах, застаецца нязменнай да канца тэрміну пазыкі, а выйграўшыя аблігацыі пагашаюцца пры выплаце выйгрышаў і ў далейшых тыражах удзелу не прымаюць.

Каб гарантаваць захаванасць зберажэнняў, змешчаных у аблігацыі пазыкі, набываемыя аблігацыі за нязначную плату (0,1 кап. у месяц за кожную аблігацыю) можна здаць на захаванне ў ашчадную касу. Іх уладальніку выдаецца захоўнае пасведчанне. Прынятыя на захаванне аблігацыі ашчадныя касы рэгулярна правяраюць па табліцах тыражоў выйгрышаў і аб выйгрышах паведамляюць іх уладальніку ў пісьмовай форме (калі ён выказаў на гэта жаданне пры афармленні аблігацый на захаванне).

Маючы аблігацыі пазыкі, можна стаць уладальнікам выйгрышу ад 40 да 5 000 рублёў.

Набывайце аблігацыі, удзельнічайце ў тыражах выйгрышаў!

А. ІГНАТОВІЧ.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.